Раздзел 1.

# ПЕРАДУМОВЫ І ФАКТАРЫ ПАВЫШЭННЯ ЯКАСЦІ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ

С.В. Мянькова,
начальнік аддзела вучэбна-метадычнага забеспячэння павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

А.У. Белікава,
намеснік начальніка аддзела вучэбна-метадычнага забеспячэння павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

## Нарматыўнае прававое забеспячэнне адукацыйнага працэсу дадатковай адукацыі дарослых у сферы культуры

Дадатковая адукацыя дарослых з'яўляецца важным элементам сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь.

У 2011 г. быў прыняты Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі (далей — Кодэкс), які спрыяў паляпшэнню нарматыўнага прававога забеспячэння ДАД, стварэнню стабільнасці сістэмы, умацаванню яе прэстыжу, а таксама павышэнню якасці адукацыі [15].

Раздзел 14 Кодэкса, які прысвечаны ДАД, вызначае яе сістэму, удзельнікаў, адукацыйныя праграмы, стандарты, патрабаванні да арганізацыі адукацыйнага працэсу, яго навукова-метадычнае забеспячэнне.

Парадак дзейнасці і структура ўстаноў ДАД, пералік удзельнікаў адукацыйнага працэсу, іх правы і абавязкі, парадак прыёму, а таксама кіраванне і фінансаванне гэтых устаноў рэгулююцца Палажэннем аб установе дадатковай адукацыі дарослых, зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 28 ліпеня 2011 г. № 198 [7].

У адпаведнасці з Кодэксам адукацыйныя праграмы ДАД рэалізуюцца ва ўстановах ДАД, іншых установах адукацыі і арганізацыях, індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якім згодна з заканадаўствам прадастаўлена права ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сістэме ДАД налічваюцца 12 адукацыйных праграм. Асноўнымі адукацыйнымі праграмамі ДАД у сферы культуры з'яўляюцца:

адукацыйная праграма перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю;

адукацыйная праграма перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю;

адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў;

адукацыйная праграма стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў;

адукацыйная праграма навучальных курсаў (тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў, лекторыяў і іншых відаў навучальных курсаў).

Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм ДАД у сферы культуры арганізуецца на аснове:

прынцыпаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы адукацыі;

адукацыйных стандартаў (пры рэалізацыі адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў);

дасягненняў у галіне навукі і тэхнікі, якія рэалізуюцца ў эканоміцы і сацыяльнай сферы;

педагагічна абгрунтаванага выбару форм, метадаў і сродкаў навучання і выхавання;

культурных традыцый і каштоўнасцей беларускага народа, дасягненняў сусветнай культуры;

сучасных адукацыйных і інфармацыйных тэхналогій.

Арганізацыя адукацыйнага працэсу накіравана на дасягненне асноўнай мэты ДАД — прафесійнага развіцця слухачоў і стажораў, задавальнення іх пазнавальных запатрабаванняў.

Асноўнымі задачамі арганізацыі адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі адукацыйных праграм ДАД у сферы культуры з'яўляюцца:

забеспячэнне адпаведнасці патрабаванням нарматыўных прававых, тэхнічных нарматыўных прававых актаў сістэмы ДАД;

своечасовае фарміраванне кантынгенту слухачоў, якія накіроўваюцца для засваення зместу адукацыйных праграм перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі;

камплектаванне вучэбных груп на аснове кантрольных лічбаў прыёму, якія штогод зацвярджаюцца загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь;

поўнае і якаснае выкананне вучэбных планаў і праграм;

вызначэнне канкрэтных функцый службовых асоб, прафесарска-выкладчыцкага, метадычнага саставаў па арганізацыі і рэсурснаму забеспячэнню адукацыйнага працэсу;

забеспячэнне аптымальнай вучэбнай загружанасці слухачоў, своечасовага і якаснага выканання вучэбнай нагрузкі прафесарска-выкладчыцкім саставам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Неабходнымі ўмовамі для арганізацыі і ажыццяўлення адукацыйнага працэсу пры рэалізацыі зместу адукацыйных праграм з’яўляецца наяўнасць:

навукова-метадычнага забеспячэння (вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм, вучэбна-метадычнай дакументацыі, вучэбных выданняў, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў);

матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння (аўдыторнага фонду, матэрыяльна-тэхнічных сродкаў);

кваліфікаванага прафесарска-выкладчыцкага саставу;

сродкаў маніторынгу адукацыйнага працэсу (тэстаў, анкет).

Асноўнымі дакументамі для планавання, арганізацыі і ажыццяўлення адукацыйнага працэсу вызначаны: вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў — адукацыйныя стандарты, тыпавыя вучэбныя планы, вучэбныя планы; вучэбныя праграмы па дысцыплінах спецыяльнасцей перападрыхтоўкі; вучэбныя праграмы, вучэбныя і вучэбна-тэматычныя планы павышэння кваліфікацыі; вучэбныя праграмы стажыроўкі; вучэбныя праграмы навучальных курсаў.

Змест названых дакументаў вызначаецца:

кваліфікацыйнымі патрабаваннямі, што прад’яўляюцца да канкрэтнай службовай катэгорыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў;

інструктыўнымі матэрыяламі і метадычнымі рэкамендацыямі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь;

дакументамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь;

асноўнымі перспектыўнымі напрамкамі развіцця галіны, а таксама дасягненнямі айчыннай і замежнай навукі, тэхнікі і перадавой тэхналогіі.

Тэрмін атрымання адукацыі па адукацыйных праграмах перападрыхтоўкі вызначаецца: адукацыйнымі стандартамі і тыпавымі вучэбнымі планамі перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія зацверджаны Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь; графікамі вучэбнага працэсу, якія ўлічваюць каляндарныя тэрміны тэарэтычных і іншых відаў заняткаў і адпавядаюць патрабаванням Палажэння аб бесперапыннай прафесійнай адукацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 ліпеня 2011 г. № 954 [1].

Тэрмін атрымання адукацыі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, не павінен перавышаць 18 месяцаў (вочная форма атрымання адукацыі) і 24 месяцаў (завочная форма). Тэрмін атрымання адукацыі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, не павінен перавышаць 7 месяцаў (вочная форма атрымання адукацыі) і 9 месяцаў (завочная форма).

У Інбелкульце тэрмін атрымання адукацыі пры засваенні зместу адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вышэйшую адукацыю, па спецыяльнасцях «Камунікацыя ў сферы музейнай дзейнасці», «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» складае 24 месяцы (завочная форма атрымання адукацыі); пры засваенні зместу адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, па спецыяльнасцях «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія», «Культурна-адукацыйная дзейнасць» — 9 месяцаў (завочная форма).

Тэрмін атрымання адукацыі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў у Інбелкульце складае ад 1 да 2 тыдняў у адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства.

Тэрмін атрымання адукацыі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў устанаўліваецца арганізацыяй, якая накіроўвае работніка на навучанне, па ўзгадненню з арганізацыяй, у якой рэалізуецца адукацыйная праграма стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, зыходзячы з яе мэт і зместу, але не павінен перавышаць пры вочнай форме навучання 5 месяцаў, пры завочнай форме — 8 месяцаў.

Форма і змест вучэбных планаў і вучэбных праграм адукацыйных праграм павінны адпавядаць патрабаванням Інструкцыі аб агульных патрабаваннях да вучэбных планаў, вучэбных праграм, вучэбна-тэматычных планаў, на падставе якіх ажыццяўляецца павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка кіраўнікоў і спецыялістаў, аб парадку іх распрацоўкі і зацвярджэння, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 9 лістапада 2009 г. № 70 [3].

Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі ў Інбелкульце распрацавана з улікам катэгорый і спецыяльнасцей слухачоў.

Пры распрацоўцы вучэбных планаў перападрыхтоўкі ўлічваліся наступныя адсоткавыя суадносіны вучэбных гадзін, размеркаваных па кампанентах адносна іх сумарнай колькасці, што адпавядае заканадаўчай базе сістэмы ДАД:

гуманітарныя і сацыяльна-эканамічныя дысцыпліны — 2—6 %;

агульнапрафесійныя дысцыпліны і дысцыпліны спецыяльнасці — 70—85 %;

кампанент установы адукацыі — да 10 %.

Вучэбна-праграмная дакументацыя адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі ў Інбелкульце складзена з улікам практыкаарыентаванага падыходу. Суадносіны тэарэтычнага і практычнага кампанентаў вучэбна-тэматычных планаў адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі наступныя: тэарэтычны блок — 25—30 % ад агульнай колькасці гадзін, практычны кампанент — 70—75 %.

Для арганізацыі работы прафесарска-выкладчыцкага саставу пры рэалізацыі зместу адукацыйных праграм ДАД, планавання і ўліку іх вучэбнай нагрузкі неабходна кіравацца загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 24 лістапада 1999 г. № 699 «Аб зацвярджэнні прыкладных норм часу для разліку аб’ёму вучэбнай работы і асноўных відаў вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і іншых



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

работ, што выконваюцца прафесарска-выкладчыцкім саставам вышэйшых навучальных установ» [11].

Для арганізацыі работы прафесарска-выкладчыцкага саставу Інбелкульта пры рэалізацыі зместу адукацыйных праграм ДАД штогод рыхтуецца загад «Аб нормах часу для разліку аб’ёму вучэбнай работы прафесарска-выкладчыцкага саставу».

Да засваення зместу адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, могуць прымацца студэнты старшых курсаў установ вышэйшай адукацыі (студэнты вочнай формы навучання двух апошніх курсаў і магістранты). Парадак прыёму студэнтаў на адукацыйныя праграмы перападрыхтоўкі і парадак атрымання імі адукацыі рэгулююцца Інструкцыяй аб парадку перападрыхтоўкі студэнтаў старшых курсаў вышэйшых навучальных установ, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 14 лістапада 2005 г. № 95 [5].

Прыём асоб для засваення зместу адукацыйных праграм ДАД у Інбелкульт на бюджэтнай аснове ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Планам павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў сферы культуры, які зацвярджаецца штогод Міністрам культуры Рэспублікі Беларусь. Фарміраванне кантынгенту слухачоў у Інбелкульце ажыццяўляецца ў адпаведнасці з лакальным нарматыўным актам «Правілы прыёму слухачоў у ДУА “Інстытут культуры Беларусі” для засваення зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых».

Пры рэалізацыі адукацыйных праграм ДАД асновай узаемаадносін яе ўдзельнікаў з’яўляюцца дагаворы ў сферы адукацыі, тыпавыя формы якіх зацверджаны пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21 ліпеня 2011 г. № 99 [12].

Згодна з Кодэксам напаўняльнасць вучэбных груп слухачоў, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм павышэння кваліфікацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, складае ад 25 да 30 чалавек; за кошт сродкаў юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў, фізічных асоб або ўласных сродкаў — устанаўліваецца ўстановай адукацыі. У мэтах фарміравання кантынгенту слухачоў у Інбелкульце з улікам патрабавання заканадаўства аб напаўняльнасці вучэбных груп слухачоў павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі, якія навучаюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, штогод праводзіцца маніторынг адукацыйных запатрабаванняў работнікаў сферы культуры.

З асобамі, што паступаюць у Інбелкульт для засваення зместу адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, у мэтах вызначэння ўзроўню іх агульнапрафесійных ведаў праводзіцца ўступная гутарка ў адпаведнасці з Палажэннем аб парадку правядзення ўступнай гутаркі са слухачамі, што



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

паступаюць для засваення зместу адукацыйных праграм перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў.

Кожнаму з залічаных выдаюцца на перыяд навучання заліковая кніжка і білет слухача ў адпаведнасці з патрабаваннямі пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 12 жніўня 2011 г. № 225 [14].

Парадак пераводу, аднаўлення і адлічэння слухачоў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю, распаўсюджваецца на ўстановы ДАД, іншыя ўстановы адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы перападрыхтоўкі, незалежна ад іх формы ўласнасці і падпарадкавання, і рэгулюецца Інструкцыяй аб парадку пераводу, аднаўлення і адлічэння слухачоў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2014 г. № 3 [4].

Слухачы адукацыйных праграм ДАД праходзяць бягучую і выніковую атэстацыю. Бягучую атэстацыю праходзяць толькі пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю. Парадак правядзення выніковай атэстацыі стажораў, слухачоў, формы бягучай і выніковай атэстацыі і парадак ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці слухачоў вызначаюцца ў адпаведнасці з Правіламі правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі [10], Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі [8]. Парадак правядзення бягучай атэстацыі слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм ДАД вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі слухачоў, стажораў пры засваенні зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых [9].

Выніковую атэстацыю не праходзяць слухачы, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы навучальных курсаў (лекторыяў, тэматычных семінараў, практыкумаў, трэнінгаў і інш.).

Выніковая атэстацыя стажораў згодна з Кодэксам праводзіцца ў форме абароны справаздачы аб выніках стажыроўкі.

Формы выніковай атэстацыі слухачоў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў вызначаюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі Кодэкса.

Парадак правядзення бягучай і выніковай атэстацыі ў Інбелкульце ўсталяваны Палажэннем аб арганізацыі адукацыйнага працэсу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У мэтах эфектыўнай падрыхтоўкі слухачамі кантрольнай работы, рэферата, дыпломнай работы ў Інбелкульце распрацаваны: Палажэнне аб кантрольнай рабоце, Палажэнне аб рэфераце, Палажэнне аб дыпломнай рабоце.

Слухачам, што прайшлі поўны курс навучання па адукацыйнай праграме перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую або сярэднюю спецыяльную адукацыю, абаранілі дыпломную работу, здалі дзяржаўныя экзамены, рашэннем дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі прысвойваецца кваліфікацыя і выдаецца дыплом аб перападрыхтоўцы на ўзроўні вышэйшай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі і дадатак да дыплома.

Слухачам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў і прайшлі выніковую атэстацыю, выдаецца дакумент аб адукацыі — пасведчанне аб павышэнні кваліфікацыі ўстаноўленага ўзору.

Слухачам, якія засвоілі змест адукацыйнай праграмы стажыроўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў і прайшлі выніковую атэстацыю, выдаецца дакумент аб адукацыі — пасведчанне аб стажыроўцы кіруючых работнікаў і спецыялістаў устаноўленага ўзору.

Бланкі дакументаў аб адукацыі запаўняюцца ў адпаведнасці з пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 27 ліпеня 2011 г. № 194 «Аб дакументах аб адукацыі, дадатках да іх, залатым, сярэбраным медалях і дакументах аб навучанні» [2].

Згодна з Кодэксам навукова-метадычнае забеспячэнне сістэмы ДАД уключае:

вучэбна-праграмную дакументацыю адукацыйных праграм;

праграмна-плануючую дакументацыю выхавання;

вучэбна-метадычную дакументацыю;

вучэбныя выданні;

інфармацыйна-аналітычныя матэрыялы.

Навукова-метадычнае забеспячэнне ДАД ажыццяўляюць:

арганізацыі ДАД;

установы ДАД;

іншыя ўстановы адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы ДАД;

арганізацыі, якія накіроўваюць работнікаў для засваення зместу адукацыйных праграм ДАД;

вучэбна-метадычныя аб'яднанні ў сферы ДАД.

Для ўдасканалення навукова-метадычнага забеспячэння ў сістэме ДАД, правядзення экспертызы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйных праграм ДАД, удзелу ў распрацоўцы і ўдасканаленні адукацыйных стандартаў перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, узгаднення рукапісаў падручнікаў, вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў сістэмы ДАД ствараюцца вучэбна-метадычныя аб'яднанні ў сферы ДАД (далей — ВМА). Парадак дзейнасці ВМА рэгулюецца Палажэннем аб вучэбна-метадычных аб'яднаннях у сферы дадатковай адукацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дарослых, зацверджаным пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 28 ліпеня 2011 г. № 195 [6].

Такім чынам, створаная сёння сістэма ДАД дзякуючы ўдасканаленню нарматыўнага прававога забеспячэння, у тым ліку Кодэксу, іншым нарматыўным прававым актам, дзейнічае паспяхова, што спрыяе паляпшэнню работы арганізацый ДАД. Аднак пэўныя аспекты патрабуюць карэкціроўкі ў сферы прымянення.

Так, у адпаведнасці з заканадаўствам ВМА ствараюцца па профілях адукацыі, напрамках адукацыі і асобных спецыяльнасцях на базе вядучых устаноў ДАД. На сённяшні час сфарміраваны і дзейнічаюць толькі тры ВМА на базе вядучых устаноў ДАД:

ДУА «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» — па профілю адукацыі «Педагогіка» і напрамках адукацыі «Педагогіка дзяцінства», «Педагогіка падлеткавага і юнацкага ўзросту», «Педагогіка агульнаўзроставая»; па профілю адукацыі «Педагогіка. Прафесійная адукацыя» і напрамках адукацыі «Прафесійная адукацыя», «Кіраванне ў сферы адукацыі»;

УА «Інстытут перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі суддзяў, работнікаў пракуратуры, судоў і ўстаноў юстыцыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта» — па профілю адукацыі «Камунікацыі. Права. Эканоміка. Кіраванне. Эканоміка і арганізацыя вытворчасці» і напрамку адукацыі «Права»;

УА «Дзяржаўны інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў у галіне газазабеспячэння “ГАЗ-ІНСТЫТУТ”» — па профілю адукацыі «Тэхніка і тэхналогіі» і напрамку адукацыі «Энергетыка».

Пытанням удасканалення навукова-метадычнага забеспячэння сістэмы ДАД у цяперашні час надаецца першачарговае значэнне. Так, у красавіку 2016 г. у ДУА «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы» (далей — РІВШ) адбылася нарада кіраўнікоў устаноў ДАД, на якой было прынята рашэнне аб неабходнасці перагляду шэрага нарматыўных прававых актаў, якія рэгламентуюць дзейнасць устаноў ДАД па дадзенаму пытанню, прадастаўлення ВМА пэўных паўнамоцтваў (напрыклад, па маніторынгу навукова-метадычнага забеспячэння рэалізацыі адукацыйных праграм з мэтай павышэння якасці ДАД) і інш.

Нарматыўная прававая база сістэмы ДАД працягвае развівацца і ўдасканальвацца. Так, у 2014 г. былі ўнесены дапаўненні ў Палажэнне аб бесперапыннай прафесійнай адукацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія скарацілі тэрмін перыядычнасці павышэння кваліфікацыі педагагічных работнікаў устаноў адукацыі, што рэалізуюць адукацыйныя праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, — 1 раз у 3 гады, а не 1 раз у 5 гадоў, як было раней, а тэрмін атрымання адукацыі скарочаны да 1 тыдня (раней — 2 тыдні) з агульнай колькасцю вучэбных гадзін па вучэбна-тэматычнаму плану ад 36 да 60 [13].

Падрыхтаваны да зацвярджэння праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь “Аб навуковай дзейнасці” і Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 2016 г. плануюцца перагляд дзеючых тыпавых вучэбных планаў перападрыхтоўкі і адукацыйных стандартаў па спецыяльнасцях перападрыхтоўкі, сістэмы спецыяльнасцей перападрыхтоўкі ў працэсе фарміравання новага Агульнадзяржаўнага класіфікатара Рэспублікі Беларусь «Спецыяльнасці і кваліфікацыі», унясенне змяненняў і дапаўненняў у некаторыя іншыя нарматыўныя прававыя акты.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Аб асобных пытаннях дадатковай адукацыі дарослых [Электронны рэсурс] : пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 15 ліп. 2011 г., № 954. — Рэжым доступу : pravo.levonevsky.org/bazaby11/... . — Дата доступу : 07.06.2016.
2. Аб дакументах аб адукацыі, дадатках да іх, залатым, сярэбраным медалях і дакументах аб навучанні [Электронны рэсурс] : пастанова Міністэрства адукацыі Рэсп. Беларусь, 27 ліп. 2011 г., № 194. — Рэжым доступу : psec.by/?show=14. — Дата доступу : 07.06.2016.
3. Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб агульных патрабаваннях да вучэбных планаў, вучэбных праграм, вучэбна-тэматычных планаў, на падставе якіх ажыццяўляецца павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка кіраўнікоў і спецыялістаў, аб парадку іх распрацоўкі і зацвярджэння [Электронны рэсурс] : пастанова Міністэрства адукацыі Рэсп. Беларусь, 09 ліст. 2009 г., № 70. — Рэжым доступу : uomoik.gov.by/page/dop-obr-... . — Дата доступу : 07.06.2016.
4. Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб парадку пераводу, аднаўлення і адлічэння слухачоў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, адукацыйнай праграмы перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю [Электронны рэсурс] : пастанова Міністэрства адукацыі Рэсп. Беларусь, 9 студз. 2014 г., № 3. — Рэжым доступу : edu.gov.by/page-1401. — Дата доступу : 07.06.2016.
5. Аб зацвярджэнні Інструкцыі аб парадку перападрыхтоўкі студэнтаў старэйшых курсаў вышэйшых навучальных устаноў [Электронны рэсурс] : пастанова Міністэрства адукацыі Рэсп. Беларусь, 14 ліст. 2005 г. № 95. — Рэжым доступу : newsby.org/documents/razn/pos07/... . — Дата доступу : 07.06.2016.
6. Аб зацвярджэнні Палажэння аб вучэбна-метадычных аб'яднаннях у сферы дадатковай адукацыі дарослых [Электронны рэсурс] : пастанова Міністэрства адукацыі Рэсп. Беларусь, 28 ліп. 2011 г., № 195. — Рэжым доступу : pravo.levonevsky.org/bazaby11/... . — Дата доступу : 07.06.2016.
7. Аб зацвярджэнні Палажэння аб установе дадатковай адукацыі дарослых [Электронны рэсурс] : пастанова Міністэрства адукацыі Рэсп. Беларусь, 28 ліп. 2011 г., № 198. — Рэжым доступу : content.schools.by/st-vysokoe. — Дата доступу : 07.06.2016.
8. Аб зацвярджэнні Правілаў правядзення атэстацыі навучэнцаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм сярэдняй спецыяльнай адукацыі [Электронны рэсурс] : пастанова Міністэрства адукацыі Рэсп. Беларусь, 22 ліп. 2011 г., № 106. — Рэжым доступу : kodeksy-by.com/norm_akt/source-... . — Дата доступу : 07.06.2016.






РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. Аб зацвярджэнні Правілаў правядзення атэстацыі слухачоў, стажораў пры засваенні зместу адукацыйных праграм дадатковай адукацыі дарослых [Электронны рэсурс] : пастанова Міністэрства адукацыі Рэсп. Беларусь, 24 сн. 2013 г., № 135. — Рэжым доступу : online.zakon.kz/Document?doc_id=.. . — Дата доступу : 07.06.2016.
10. Аб зацвярджэнні Правілаў правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі [Электронны рэсурс] : пастанова Міністэрства адукацыі Рэсп. Беларусь, 29 мая 2012 г., № 53. — Рэжым доступу : kodeksy-by.com/norm_akt/source-... . — Дата доступу : 07.06.2016.
11. Аб зацвярджэнні прыкладных норм часу для разліку аб'ёму вучэбнай працы і асноўных відаў вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай і іншых работ, што выконваюцца прафесарска-выкладчыцкім саставам вышэйшых навучальных устаноў [Электронны рэсурс] : загад Міністэрства адукацыі Рэсп. Беларусь, 24 ліст. 1999 г., № 699. — Рэжым доступу : pravo.levonevsky.org/bazaby11/... . — Дата доступу : 07.06.2016.
12. Аб зацвярджэнні тыпавых форм дагавораў у сферы адукацыі [Электронны рэсурс] : пастанова Міністэрства адукацыі Рэсп. Беларусь, 21 ліп. 2011 г., № 99. — Рэжым доступу : pravo.levonevsky.org/bazaby11/... — Дата доступу : 07.06.2016.
13. Аб унясенні дапаўненняў у пастанову Савета Міністраў Рэсп. Беларусь ад 15 ліпеня 2011 г. № 954 [Электронны рэсурс] : пастанова Савета Міністраў Рэсп. Беларусь, 24 сак. 2014 г., № 253. — Рэжым доступу : kodeksy-by.com/norm_akt/source-.. . — Дата доступу : 07.06.2016.
14. Аб устанаўленні ўзораў білета слухача і залікова кніжкі [Электронны рэсурс] : пастанова Міністэрства адукацыі Рэсп. Беларусь, 12 жн. 2011 г., № 225. — Рэжым доступу : pravo.levonevsky.org/bazaby11/... . — Дата доступу : 07.06.2016.
15. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. — Мінск : Нац. цэнтр прававой інфармацыі Рэсп. Беларусь, 2011. — 400 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ